# Культура радавой памяці ў жыцці каталіцкай парафіі

Павел Булаты, магістар кіравання
РІВШ

# Род жыве – пакуль жыве памяць аб ім

Як правіла, выгасанне роду азначала спыненне памяці аб ім у шырокіх колах грамадства.




**Захаванне памяці пра свой род у часе – задача для эліт актуальная.**



ЧАС



# Азін са спосабаў захавання памяці – захаванне яе ў сацыяльных інстытутах

Гэты спосаб рэалізуецца праз растаноўку разнастайных маркераў у прасторы пэўных і трывалых устаноў:

**Імя роду займае прастору.**

Адзін з моцных сацыяльных інстытутаў у грамадстве ВКЛ –

**Царква.**





# «...Верны ў малым і ў вялікім верны...»

Родавая памяць захоўвалася на розных узроўнях. Увага надавалася ў тым ліку і мікра-ўзроўню, захаванню родавай памяці ў вузкіх супольнасцях.

Перадусім – **на ўзроўні царкоўных парафій**.

## ЗАХАВАННЕ ПАМЯЦІ

Праз **візуалізацыю** ў прасторы





Праз усталяванне **дзейнасці** ў супольнасці



# Ляхавіцкая каталіцкая парафія

ахоплівала буйны маёнтак – Ляхавіцкае графства, якое належала прадстаўнікам эліты: Гаштольдам, Хадкевічам, Сапегам, Масальскім. Для некаторых прадстаўнікоў адзначаных сямей Ляхавічы былі рэзідэнцыя.







## ЗАХАВАННЕ ПАМЯЦІ

Праз **візуалізацыю** ў прасторы:

1) Тытул храма
2) Утрыманне алтароў і капліц
3) Літургічныя рэчы

Праз усталяванне **дзейнасці** ў супольнасці

1) Спецыяльнае набажэнства

# Тытул храма



Першы Ляхавіцкі касцёл быў узведзены ў **1535** г. па фундацыі Альбрэхта Гаштольда. Новаўзведзеная святыня была асвечаная ў гонар **Святога Адальбэрта** (Войцеха), які з'яўляўся нябесным патронам фундатара.





**12 траўня 1602 г.** Ян Караль Хадкевіч і яго жонка Соф'я Мілецкая далі фундушовы запіс на ўзвядзенне новага парафіяльнага касцёлу ў Ляхавічах з тытулам **Узвіжання Крыжа Господняга, Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі, Святога Ян Хрысціцеля і Святой Сафіі.**









**ЯК БАЧЫМ, ФУНДАТАРЫ ЛЯХАВІЦКІХ КАСЦЁЛАЎ ЗАМАЦОЎВАЛІ ІМЯ СВАЙГО НЯБЁСНАГА ПАТРОНА Ў ТЫТУЛЕ ХРАМА**

# Усталяванне набажэнства

**У выдадзеным касцёлу фундатарскім запісу, вызначаўся пэўны час, калі святары мусілі ладзіць спецыяльную імшу за фундатараў касцёла.**



Фундошовым запісам **1602 г.** ад Яна Караля Хадкевіча і яго жонкі вызначалася: што плябан кожны тыдзень, а менавіта ў сераду, павінен быў маліцца за дабрадзеяў касцёла. Імша ладзілася да **1780-х**.

Пры чарговым аднаўленні касцёла ў **1780-я** біскупам І. Масальскім была ўсталяваная новая традыцыя: набажэнствы за фундатара сталі праводзіцца два разы кожны тыдзень без пазначэння дня.



# Алтары і капліцы

## З тытулам нябёснага патрону



У 1600-я Хадкевічам быў закладзены алтар Святой Ганны (патронка дачкі), якім надалей апекавалася аднайменнае брацтва





У 1653 г. аканомам Ляхавіцкага графства Янам Казімірам Кнофам у касцёле быў закладзены алтар Св. Казіміра



## З іншым тытулам



У 1650-я ўладальнікам Ляхавіцкага графства Казімірам Леонам Сапегам закладаецца алтар Святога Анёла Ахоўніка





У 1650-я капліца ў гонар Панны Марыі з алтаром утрымлівалася на сродкі Мікалая Міхала Здановіча



# Алтары і капліцы



У **1740-я** г. Наваградскім стражнікам Дамінікам Рэйтанам у Ляхавіцкім касцёле быў закладзены і ўтрымліваўся алтар Святога Апостала Тадэвуша, які з'яўляўся нябёсным апекуном яго маленькага сына Тадэвуша – будучуга нацыянальнага героя Беларусі.



**У Ляхавіцкім касцёле быў алтар у гонар патрона Тадэвуша Рэйтана, змяшчалася мемарыяльная дошка. Там жа, ён быў і пахаваны.**



# Ахвяраванні. Літургічныя рэчы

З актаў касцельных візітацый і інвентароў вядома, што ў Ляхавіцкім касцёле знаходзілася шмат літургічных рэчаў з геральдыкай і адзнакамі розных шляхецкіх сям'яў, а таксама ануітэты на ўтрыманне бажніцы. Агулам з 1602 па 1793 г. з Ляхавіцкім касцёлам у гэтым плане было звязана звыш некалькі дзесяткаў родаў.



**Такім чынам, *Ляхавіцкі* касцёл як сацыяльны інстытут на мікра-узроўні з’яўляўся месцам захавання родавай памяці для шматлікіх сем’яў, прычым рознага сацыяльнага становішча: ад эліты да павятовай шляхты. Адбывалася гэта праз розныя маркеры, якія фіксаваліся ў прасторы: тытул святыні, адмысловыя набажэнствы за дабрадзеяў, тытулы алтароў і капліц, а таксама літургічныя ахвяраванні.**

**Са знікненнем старога *Ляхавіцкага* касцёла абарвалася і родавая памяць у прасторы**

# Культура радавой памяці ў жыцці каталіцкай парафіі

**Павел Булаты, магістар кіравання
РІВШ**